# Нататкі падарожніка

**М**агілёўшчына атрымала добры падарунак ад краязнаўцы, пісьменніка Віктара Арцем’ева. Амаль усе сто сорак восем старонак кнігі «Шчодрасць душы», якая выйшла сёлета ў магілёўскім выдавецтве «АмеліяПрынт», прысвечаны людзям і падзеям Шклоўшчыны, Краснаполля, Кругляншчыны, Чэрыкаўшчыны, Асіповіччыны. Аўтар уключыў у зборнік нататкі з вандровак па родных мясцінах у розныя гады жыцця, шэраг легенд, пачутых у Шклове і Чэрыкаве, колькі бытавых гумарэсак і бываліц, а таксама ўспаміны з паездак у Маскву, Уладзімір, Багалюбава, Баку, Адэсу, Баржомі. Атрымаўся своеасаблівы калейдаскоп цікавых матэрыялаў, многія з якіх, як можна зразумець з кантэксту, раней з’яўляліся ў перыядычным друку Беларусі, але ў кнігу ўвайшлі абноўленымі і дапоўненымі. Яны аб’яднаныя адзіным клопатам аўтара — захаваць культурную і гістарычную спадчыну Бацькаўшчыны. Цікава чытаюцца эпізоды падарожжаў В. Арцем’ева ў далёкія ад радзімы мясціны: разважанне пра побыт і культуру азербайджанцаў і абавязковае параўнанне (не, не проста з беларускім!) — магілёўскім, сваім; хвалюючая гісторыя пра франтавіка, Героя Савецкага Саюза, падводніка А. Марынескі, з нашчадкамі якога аўтар пазнаёміўся падчас паездкі ў Багалюбаў. Яшчэ больш арыгінальныя запісы нястомнага вандроўніка з паездак у Карэліцкі раён і знакамітыя купалаўскія Ляўкі. Чытачы даведаюцца пра незвычайнага чалавека свайго часу Пятра Шчарбакова — старшыні калгаса, неверагоднага бібліяфіла з Кайшоўкі (Карэліцкі раён), які сабраў унікальную бібліятэку з каштоўнымі выданнямі. Магчыма, нехта з чытачоў адкрые таямніцу лёсу кайшоўскай хатняй бібліятэкі, якую пры жыцці гаспадара прапаноўвалі набыць за вялікія грошы палякі і чэхі і след якой пасля заўчаснай смерці П. Шчарбакова аўтар кнігі згубіў. Да месца прыведзены В. Арцем’евым і згадкі выпадковай спадарожніцы пра сустрэчы з Купалам у Ляўках. Але самыя каштоўныя перліны зборніка «Шчодрасць душы» — гэта старонкі летапісу магілёўскага краю. Колькі цікавых асоб і лёсаў трапляе ў поле зроку аўтара! Гэта і прафесіяналы бібліятэчнай справы, апантаныя кнігалюбы Магілёўшчыны (М. Барадзінская, М. Ласоўскі), і таленавітыя музыкі (Я. Маланкоў), і майстры жывога мастацкага слова, артысты (В. Ермаловіч, З. Феакцістава). Цікаўны чытач знойдзе ў зборніку адказы на цэлы шэраг нетрывіяльных пытанняў пра тых, чый лёс так ці інакш быў звязаны з Магілёўшчынай. Чаму магіла рускага мастака Мікалая Неўрава знаходзіцца ў вёсцы Лыскоўшчына і як ушаноўваецца памяць жывапісца? Што рабіў у вёсцы Карма-Пайкі малады пісьменнік Аляксандр Вампілаў (той самы, аўтар п’есы «Старэйшы сын»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паводле якой створаны любімы многімі кінафільм з Леонавым, Карачанцавым і Баярскім у галоўных ролях)? Як у Віктара Карамазава на Магілёўшчыне нараджалася задума кнігі «Мастак і парабкі»? Калі паэт Аляксей Пысін, ураджэнец Краснаполля, вырашыў, што архіва ў яго не будзе? Чаму ў кішчыцкіх паўстанцаў свая праўда пра расстрэл 1905 года?.. «Хуткаплынны наш век. На маім жыцці колькі вёсак знікла з карты краю», — са скрухай зазначае В. Арцем’еў. У кнізе «Шчодрасць душы» сабрана тое, чым узбагачаецца наша нацыянальная памяць, таму вялікае шкадаванне выклікае невялікі наклад зборніка.

Таццяна ХОМІЧ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ